дысцыплінах (магчыма па курсах: для І курса, для ІІ курса па асобных раздзелах).

Спалучэнне бягучага і выніковага кантролю як спосабу забеспячэння самастойнай сістэматычнай працы студэнтаў.

Для паляпшэння засваення матэрыялу курса "Тэорыя бібліятэчнай справы" мэтазгодна арганізаваць у верасні (для студэнтаў І курса на ўстановачнай сесіі, калі ў студэнтаў толькі лекцыі і няма іншых відаў заняткаў) экскурсіі ў буйныя універсальныя і спецыяльныя бібліятэкі г. Мінска.

Студэнты-завочнікі, большасць якіх пражывае не ў Мінску, на лекцыях разглядаюць тыпалагічныя асаблівасці універсальных і спецыяльных бібліятэк, на экскурсіях у іх з'явіцца магчымасць пазнаёміцца з гэтымі бібліятэкамі і асаблівасцямі іх дзейнасці.

Аптымізацыя самастойнай працы студэнтаў-завочнікаў з'яўляецца адным са шляхоў пераходу на новую тэхналогію навучання, што ў канчатковым выніку будзе садзейнічаць павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў ва універсітэце.

***Трамбіцкі У.У., ст. выкладчык***

## ДЫСКЕТЫ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ

Новыя тэхналогіі могуць садзейнічаць творчаму развіццю асобы і грамадства. Сацыяльная творчасць – вельмі шырокае паняцце. Асоба, выходзячы за межы працоўнай творчасці (якая з'яўляецца асноўным элементам сацыяльнай творчасці), раскрывае свае сутнасныя сілы ў сістэме культуры. Працэс культуратворчасці дапамагае фарміраванню асобы. Культуратворчасць – паняцце, што ўключае ў свой змест такія віды творчасці, як палітычная, прававая, маральная і іншыя. У гэтым артыкуле мы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пакажам, як узнікненне новых інфармацыйных тэхналогій можа ўплываць на фарміраванне творчых здольнасцей у студэнтаў і выкладчыкаў, на змяненні ўнутрыасабовай структуры суб'екта творчасці. Пры такім падыходзе не проста канстатуецца, што навукова-тэхнічны прагрэс, навукова-тэхнічная рэвалюцыя адлюстроўваюцца ў сацыяльнай дзейнасці суб'екта, але і робіцца спроба выявіць уздзеянні апошніх на суб'екта творчасці, з'яўляецца магчымасць паказаць, як можна развіць прыродныя задаткі асобы.

За апошні час адбылося многа перамен у розных сферах чалавечай дзейнасці. Дзейнасць чалавека звязана з арганізацыяй шырокага абмену інфармацыяй. У цяперашні час нікому не трэба даказваць, што новыя камп'ютэрныя тэхналогіі здольныя дапамагаць чалавеку як у захаванні інфармацыі, так і ў перадачы інфармацыі на вялікія адлегласці. Чалавецтва апынулася перад неабходнасцю выпрацоўкі прынцыпова новай парадыгмы свайго жыцця. Дасягненні ў галіне камп'ютэрных тэхналогій могуць служыць чалавеку. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі дапамагаюць рэалізаваць самыя фантастычныя прадбачанні футуролагаў. Не так даўно здавалася, што вучоны, які працуе ў сваім пакоі і мае сувязь з навейшымі дасягненнямі ў розных сферах чалавечай дзейнасці, – гэта фантастыка. Цяпер такая тэарэтычная мадэль вучонага стала рэальнасцю. У Германіі, напрыклад, працуюць віртуальныя універсітэты.

Дасягненні ў галіне камп'ютэрных тэхналогій можна выкарыстоўваць і ў навучальным працэсе. Новыя камп'ютэрныя тэхналогіі гарантуюць кожнаму чалавеку, незалежна ад яго сацыяльнай прыналежнасці, месца жыхарства, права доступу да патрэбнай навучальнай інфармацыі. Рэалізацыі такога права могуць дапамагчы дыскеты для студэнтаў завочнага навучання. Падобны падыход садзейнічае развіццю творчага патэнцыялу чалавека, сацыяльнай і культурнай сферы. Дыскеты для студэнтаў завочнага навучання могуць быць карыснымі як з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пункту гледжання забеспячэння патрэбнай інфармацыяй, так і з эканамічнага пункту гледжання.

Як прапанаваную ідэю можа рэалізаваць, напрыклад, выкладчык кафедры філасофіі і гісторыі Беларусі? Выкладчык павінен падрыхтаваць патрэбную інфармацыю для яе запісу на дыскету. Дыскеты могуць ствараццa як для агульнаадукацыйных, так і для спецыяльных дысцыплін. На дыскеце можна запісаць усю патрэбную інфармацыю для студэнтаў завочнага навучання па філасофскіх дысцыплінах (па гісторыі філасофіі, філасофіі, гісторыі і тэорыі рэлігіі, этыцы, эстэтыцы), па гістарычных дысцыплінах і г.д. На дыскеце можна запісаць неабходную інфармацыю для студэнтаў завочнага навучання першага курса канкрэтнай спецыялізацыі, другога курса канкрэтнай спецыялізацыі і г.д. Для студэнтаў завочнага навучання можна зрабіць на дыскетах такія запісы, на якіх будзе знаходзіцца ўся вучэбна-метадычная інфармацыя, патрэбная ад першага да апошняга курса. Змест дыскет з цягам часу трэба прыводзіць у суадносіны з рэальным навучальным працэсам.

Для матэрыялізацыі прапанаванай ідэі ў Беларускім універсітэце культуры патрэбна згода кіраўніцтва універсітэта, дэканата завочнага навучання і кафедраў (як агульнаадукацыйных, так і спецыяльных). Згода павінна быць і з боку студэнтаў завочнага навучання. Калі апошнія супраць, то яны могуць перанесці неабходную інфармацыю з дыскет на паперу.

З эканамічнага пункту гледжання камп'ютэр дапаможа выкладчыку і студэнту зэканоміць паперу і час. Можна распрацаваць эканамічную мадэль, якая будзе задавальняць як студэнта, так і выкладчыка, як дэканат завочнага навучання, так і кафедру камп'ютэрных тэхналогій.

Эканамічныя ўмовы, у якіх знаходзяцца выкладчыкі і студэнты, не ўсім дазваляюць мець свой камп'ютэр. Прапанаваная мадэль забяспечвала б як выкладчыку, так і студэнту доступ да камп'ютэрных тэхналогій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А што робіць студэнт завочнага навучання з дыскетай, калі ў яго няма камп'ютэра?

У гарадскіх умовах вырашыць праблему можна. У сельскіх умовах праблему можна вырашыць у раённым цэнтры.

Выкарыстанне новых камп'ютэрных тэхналогій можа садзейнічаць удасканаленню не толькі навучальнага працэсу, але і дапамагчы ў вырашэнні пытанняў, якія ўзнікаюць на ўзроўні дзяржаўнай эканамічнай палітыкі: трансфармацыі адносін уласнасці і развіцця прадпрымальніцтва, змянення сацыяльнай структуры грамадства, фарміравання самасвядомасці, развіцця культуры.

Вырашаць усе пытанні праз удасканальванне працэсу навучання немагчыма. Але намаганні ў сферы асветы, культуры здольныя садзейнічаць змяненню становішча ў эканоміцы і сацыяльнай сферы. Станоўчае ўздзеянне тэхнікі і новых тэхналогій выяўляецца ў тым, што яны могуць спрыяць змяненню становішча ў эканоміцы і сацыяльнай сферы, і ў тым, што дазваляюць вызваліць чалавека ад цяжкай і малакваліфікаванай працы, павялічыць колькасць яго вольнага часу, які ён потым зможа выкарыстаць для свайго развіцця.

Прапанаваны падыход садзейнічае збліжэнню інтарэсаў грамадства, развіццю чалавека ў творчасці. Сацыяльная творчасць – адзін з важных элементаў актыўнасці чалавека, якая мае грамадскае паходжанне і прагрэсіўнае значэнне для чалавека і грамадства. Творчасць – паняцце, у якім адлюстроўваецца дзейнасць чалавека па стварэнні новых аб'ектаў. Гэтыя аб'екты выражаюць ступені развіцця чалавека і грамадства. Прагрэсіўнае значэнне творчасці залежыць не толькі ад творцы, але і ад грамадскіх адносін, у якіх дзейнічаюць суб'екты творчасці і вынікі яго творчасці.

Прагрэс тэхнікі і новых тэхналогій уплывае на змест і характар працы. Змест працы вызначаецца ўзроўнем развіцця сродкаў працы і працоўнай сілай чалавека. Узровень развіцця тэхнікі і тэхналогіі аказвае ўплыў на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадскія і прафесійныя віды працы, на суадносіны высокакваліфікаванай і малакваліфікаванай працы. Змяненне зместу працы адлюстроўвае дыялектыку грамадскіх і асабістых інтарэсаў і патрабаванняў, рост кваліфікацыі людзей працы, садзейнічае развіццю творчых элементаў у працы.

Развіццё тэхнікі і тэхналогіі выступае ў якасці працэсу, што сведчыць пра павелічэнне ступені ўздзеяння чалавека на прыроду, павелічэнне сілы рук і розуму чалавека. Аднак рост магутнасці чалавека часта прыводзіць да так званых глабальных праблем сучаснасці.

Прагрэс тэхнікі і тэхналогіі адлюстроўваецца і ў характары працы. Ад спосабу злучэння рабочай сілы са сродкамі вытворчасці, ад грамадска-эканамічнай сутнасці працы залежаць месца чалавека ў сістэме грамадскай вытворчасці, характар працы чалавека, метады прыцягнення людзей да працы, вытворчыя адносіны, характар прысвойвання вынікаў працы.

Грамадскі прагрэс і прагрэс чалавека немагчымыя без развіцця тэхнікі і тэхналогій. Пры ўкараненні апошніх у практыку неабходна ўдзяляць увагу ў першую чаргу сацыяльнай сферы. Пры такім падыходзе трэба, каб спачатку развіваліся не новыя гіганты-пабудовы, а потым умовы для жыцця людзей, а наадварот. Пры гэтым падыходзе навукова-тэхнічны прагрэс будзе мець гуманістычны характар. Падобны падыход мяняе месца чалавека ў сістэме вытворчасці. Тады чалавек пачынае разглядацца ўжо не як аб'ект грамадскага прагрэсу, а як яго суб'ект. Гэта і ёсць цывілізаваны падыход да пытання навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Пры грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці, пры дэфармаваным сацыялізме чалавек адчуваў сябе не гаспадаром вытворчасці, а выканаўцам асобных функцый у сістэме вытворчасці. Такое месца чалавека аказвае ўплыў і на тэхніку, і на тэхналогіі.

Да апошняга часу арганізатары вытворчасці не былі зацікаўлены ў новай тэхніцы і тэхналогіі. Такое становішча

прыводзіла да таго, што ў народнай гаспадарцы ручной працай было занята каля 40 % працоўных прамысловасці, больш 35% рабочых-будаўнікоў, 2/3 сельскагаспадарчых працаўнікоў.

Найноўшая тэхніка і тэхналогія самі па сабе яшчэ не зробяць з чалавека адчужанага ад зямлі, ад сродкаў вытворчасці, ад вынікаў сваёй працы гаспадара вытворчасці. Феномен адчужанасці перашкаджае не толькі працоўнай творчасці, але нагадвае пра сябе і ў іншых сферах грамадства. Для павышэння актыўнасці ў працоўнай творчасці неабходныя ўзвышэнне чалавека працы, ператварэнне чалавека з прыдатку да рашэння вытворчых задач у суб'ект вытворчасці. На наш погляд, пераадоленне адчужанасці немагчыма без ажыццяўлення:

— узвышэння чалавека ў сістэме вытворчасці, павелічэння ступені свабоды чалавека працы;

— змянення месца чалавека працы ў сістэме вытворчасці.

Узвышэнне асобы ў сістэме вытворчых адносін немагчыма без пераадолення адчужанасці чалавека працы ад грамадскай уласнасці таму, што адчужанасць ад уласнасці аказвае ўплыў на адносіны абмену, размеркавання і інш.

Існуюць ілжывыя формы арганізацыі працы. Да апошніх можна аднесці актыўнасць шлюбных аферыстаў, прадаўцоў наркотыкаў, карцёжных шулераў.

Удасканаленне вытворчых адносін садзейнічае павелічэнню ступені свабоды ў працоўнай дзейнасці, развіццю асобы, дэмакратызацыі грамадства. З аднаго боку, працоўная творчасць немагчымая без суб'ектыўных пажаданняў. З другога боку, праца, навязаная чалавеку, устаноўленыя стандарты значна змяншаюць творчыя магчымасці.

Удасканаленне форм уласнасці – не толькі комплекс эканомікі, але і спосаб абароны чалавека працы ад грамадскіх сіл, якія могуць выступаць супраць чалавека працы. Многія цяперашнія дзяржаўныя акты садзейнічаюць удасканаленню грамадскага кіравання. Удасканаленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадскага кіравання, каардынацыя кіравання паміж гаспадарчымі і грамадскімі арганізацыямі сталі асабліва актуальнымі ў сувязі з дэмакратызацыяй грамадства. Адміністрацыйна-камандны стыль кіравання скоўваў асобу як суб'екта грамадскага прагрэсу. Названыя працэсы дэфармавалі прафесійныя і духоўныя якасці асобы. Распрацоўка праблемы самакіравання будзе садзейнічаць удасканаленню вытворчых адносін, фарміраванню актыўнай асобы, пераадоленню адказнасці за прынятыя рашэнні.

*Туровец Н.Р., профессор*

## ПУТИ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЯ ПРОЦЕССА ОБУЧЕНИЯ В МНОГОПРОФИЛЬНОМ ВУЗЕ
(на материале Краснодарской государственной академии культуры и искусств)

Краснодарская государственная академия культуры и искусств (КГАКИ) является уникальным учебно-научным и методическим центром в области культуры и искусства в пределах Северо-Кавказского региона.

Правительством России четко определены задачи академии культуры – подготовка кадров культуры и искусства высшей квалификации для краев, областей и республик Северного Кавказа и юга России. Основными потребителями молодых специалистов, подготовленных КГАКИ, являются 34 тысячи учреждений культуры и искусства.

Современная социокультурная ситуация в регионе, непрекращающаяся политическая нестабильность, динамика этнокультурных тенденций, национальные особенности и запросы духовной жизни заставляют ректорат и профессорско-преподавательский состав академии с учетом реалий сегодняшнего дня искать новые подходы к подготовке специалистов для сферы культуры, искусства и образования.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ